Funded by the European Union



# Фандрайзінг для грамадска-культурніцкіх праектаў

Модуль 2. Супрацоўніцтва з бізнесам праз КСА

## Дадатковы матэрыял да лекцыі 2.2

## ESG справаздачнасць для партнёра: шаблон і дапаможнік

Лектарка: Вераніка Шэнда

> *Гэты матэрыял дапаможа падрыхтаваць справаздачу пра супрацоўніцтва так, каб партнёр мог выкарыстаць яе дадзеныя ў сваёй ESG- або CSR-справаздачнасці.*

## Шэсць паказчыкаў, якія варта збіраць

| **Паказчык** | **Што канкрэтна вымяраць** | **Крыніца дадзеных** |
|---|---|---|
| Колькасць удзельнікаў | Агульная колькасць людзей, якія непасрэдна ўзаемадзейнічалі з праектам (наведвальнікі, удзельнікі, карыстальнікі). І асобна тых, хто ўзаемадзейнічаў неаднаразова. | Рэгістрацыя / білеты / лічыльнік на ўваходзе / статыстыка платформы (пры анлайн-фармаце). |
| Узроставыя групы | Размеркаванне ўдзельнікаў па ўзроставых катэгорыях (напр. дзеці / моладзь 14–25 / дарослыя 26–55 / 55+) — калі гэта адпавядае мэтам праекта. | Поле ва ўмове рэгістрацыі; пры адсутнасці рэгістрацыі — кропкавае апытанне на пляцоўцы. |
| Геаграфія ўдзельнікаў | Гарады / рэгіёны / краіны, адкуль паходзяць удзельнікі. Асабліва важна, калі партнёр працуе ў некалькіх лакацыях і хоча бачыць ахоп па рынках. | Поле рэгістрацыі (горад/краіна) або геаданыя платформы для анлайн-падзей. |
| Узровень уцягнутасці | Не толькі «прысутнасць», а глыбіня ўзаемадзеяння: колькі часу правялі, ці вярнуліся паўторна, ці рэкамендавалі іншым, ці пакінулі зваротную сувязь. | Паўторная рэгістрацыя, час на пляцоўцы / прагляду, апытанне «ці парэкамендуеце?». |
| Інклюзія | Доля ўдзельнікаў з груп, для якіх зніжаны бар'еры доступу (людзі з інваліднасцю, бежанцы/мігранты, людзі з абмежаванымі рэсурсамі і інш.) — калі гэта рэлевантна праекту. | Дабраахвотнае самавызначэнне ў форме рэгістрацыі (заўсёды апцыянальнае і ананімнае) або партнёрства з профільнымі арганізацыямі, якія прыводзяць гэтую групу. |
| Адукацыйны эфект | Вымяральная змена ведаў / навыкаў / стаўлення ўдзельнікаў — напрыклад, праз апытанне «да / пасля» ці колькасць атрыманых сертыфікатаў/навыкаў. | Кароткая анкета «было — стала» да і пасля мерапрыемства; тэст / рэфлексія / водгук у вольнай форме. |

## Шаблон табліцы для запаўнення

| **Паказчык** | **Значэнне** | **Крыніца дадзеных** |
| --- | --- | --- |
| Колькасць удзельнікаў | | |
| Узроставыя групы | | |
| Геаграфія ўдзельнікаў | | |
| Узровень уцягненасці | | |
| Інклюзія | | |
| Адукацыйны эфект | | |

*Не ўсе шэсць паказчыкаў абавязковыя для кожнага праекта. Абярыце тыя 2–4, якія рэальна маюць сэнс для вашага фармату.*